**А. В. ДОЎГАЛЬ,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова

# ДЫДАКТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ для моўнай падрыхтоўкі навучэнцаў IX—XI класаў

**Прапанаваны тэкст і заданні да яго з'яўляюцца дыдактычным матэрыялам для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага экзамену, алімпіяды, а таксама іх можна выкарыстаць для праверкі ўзроўню ведаў вучняў па ўсіх раздзелах беларускай мовы — ад фанетыкі да сінтаксісу. Сам тэкст складзены аўтарам паводле разнастайных публікацый, прысвечаных Дню беларускага пісьменства і размешчаных на афіцыйных сайтах СМІ.**

## Дзень (Б/б)еларускага (П/п)іс..менства

(1) Дзень (Б/б)еларускага (П/п)іс..менства — нацы..нальнае свята, якое праводзіцца з мэтай прапаганды лепшых традыцый нацы..нальнай культуры, друкаванага слова, духоўнасці беларускага народа. (2) Яно адзначаецца (што) год у першую нядзелю верасня і традыцыйна ладзіцца ў розных гарадах з багатай гістарычнай спа..чынай, даўніх цэнтрах асветы, культуры і кніга (друкавання). (3) Свята тройчы прымаў Полацк двойчы Тураў і Заслаў..е ў розныя гады сталіцамі (Д/д)ня (Б/б)еларускага (П/п)іс..менства станавіліся Н..вагрудак Н..свіж Орша Пінск Мсціслаў Мір Кам..нец Паставы Шклоў Барысаў Смаргонь Хойнікі Ганц..вічы Гл..бокае Быхаў Шчучын Рагачоў Іванава Слонім Б..лынічы К..пыль. (4) У 2021 годзе К..пыль перадаў эстафету старажытнаму гораду Добрушу, які стаў цэнтрам чарговага XXIX свята піс..менства сёлета. (5) З усімі гэтымі гарадамі звязана жыццё і дзейнасць вядомых асоб нашай краіны — піс..меннікаў, асветнікаў, грама(дс/ц)кіх і палітычных дзе..ч..ў.

(6) Праграма святочных мерапрыемстваў заўсёды дастаткова насычаная. (7) Удзельнікі і госці могуць пазнаёміцца з новымі кніжнымі выданнямі сустрэцца з беларускімі і замежнымі літ..ратарамі журналістамі выдаўцамі паслухаць выступы паэтаў і празаікаў творчых кал..ктываў і выканаўцаў наведаць выставы і кірмашы, паўдзельнічаць у аўтограф (сесіях) і зафіксаваць моманты свята ў ф..тазонах. (8) Добрай традыцыяй стала ўрачыстая цыр..монія ўзнагароджання ла..рэатаў Нацы..нальнай літ..ратурнай прэміі. (9) Многія праекты (Д/д)ня (Б/б)еларускага (П/п)іс..менства сугучныя са знакавымі для нашай краіны падзеямі, таму шырока арганізуюцца тэматычныя пляцоўкі, прысвечаныя розным п..рыядам гісторыі Беларусі і яе людзям.

(10) Сімвалічна, што (ў) першыню ў 1994 годзе (Д/д)зень (Б/б)еларускага (П/п)іс..менства адзначаўся ў старажытным Полацк.. . (11) Сюды свята **вярталася** яшчэ двойчы ў 2003 годзе па..час юбілейнага дз..сятага (Д/д)ня (Б/б)еларускага (П/п)іс..менства ў Полацк.. быў а..крыты (у/ў)нікальны помнік літары «ў» а ў 2017 годзе тут **адзначылі** важную дату нашай гісторыі і культуры 500-год..е беларускага кніга (друкавання). (12) Дзень (Б/б)еларускага (П/п)іс..менства **пакідае** пра сябе памяць не толькі ў словах і вобразах, сацы..льнай інфраструктуры гарадоў, але і ў новых турыстычных і культурных аб'ектах. (13) Напрыклад, у Ганц..віч.. **з'явіўся** помнік Якубу Коласу, у Смаргон.. — Францішку Багушэвічу, а ў Добруш.. — Івану Шамякіну. (14) У Хойнік.., на радзіме (Н/н)ароднага піс..менніка Беларусі Івана Мележа, сімвалам свята стала скульптурная кампазіцыя «Па старонках твораў Івана Мележа». (15) На галоўнай плошчы ў Быхав.. была ўсталявана скульптурная кампазіцыя «Баркулабаўскі летапіс». (16) У Іванав.. адбылося адкрыццё памятнага знак.. прысвечанага пятна..цатаму (Д/д)ню (Б/б)еларускага (П/п)іс..менства стылізаванага сонечнага гадзі(н/нн)іка. (17) Помнік выдатнаму дз..ржаўнаму дзе..чу (В/в)ялікага (К/к)ня(ст/жст)ва (Л/л)ітоўскага Льву Сапегу з'явіўся ў Слонім... (18) Гранітны анёл, які **трымае** крыламі бронзавы абраз Божай Маці, сімвалізуе цудоўнае з'яўленне цудатворнай іконы ў Б..лыніч.. . (19) Жыхары Рагачова атрымалі ў падарунак важны сацы..льны аб'ект — (Д/д)ом кнігі з бібл..тэкай, кнігарняй і канферэнц (залай), а ў К..пыл.. цяпер ёсць асобны будынак дзіцячай бібл..тэкі.

(20) Свята беларускага слова ад сам..га пачатку скіравана на духоўнае выхаванне, адр..савана ўсім пакаленням беларусаў і ахоплівае ўсю краіну. (21) Дзень (Б/б)еларускага (П/п)іс..менства гэта яшчэ адна нагода звярнуць увагу на мастацкае слова беларускую мову і культуру як духоўныя каштоўнасці якія трэба шанаваць бера..чы і памнажаць.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Заданні да тэксту

**Арфаграфія і пунктуацыя.**

**1.** Устаўце прапушчаныя літары і раскрыйце дужкі.

**2.** Расстаўце знакі прыпынку ў сказах 3, 7, 11, 16, 21.

**Фанетыка.**

**3.** Запішыце ў транскрыпцыі, як вымаўляюцца службовыя часціны мовы ў наступных спалучэннях слоў.

| Спалучэнне слоў | Вымаўленне |
|---|---|
| 1) удзельнікі і госці | |
| 2) сустрэцца з журналістамі | |
| 3) выступы паэтаў і празаікаў | |
| 4) памяць не толькі ў словах і вобразах | |
| 5) (Д/д)ом кнігі з біблі..тэкай | |
| 6) ад сам..га пачатку | |
| 7) як духоўныя каштоўнасці | |

**4.** Размяркуйце самастойныя словы са сказа 9 па слупках табліцы. Запішыце іх у той форме, у якой яны ўжываюцца ў сказе.

| Гукі = літары | Гукі > літары | Гукі < літары |
|---|---|---|
| | | |

**5.** Выберыце і падкрэсліце правільны акцэнталагічны варыянт назвы горада.

Н..ва́грудак — Н..вагру́дак, Н́..свіж — Н..сві́ж, Мсці́слаў — Мсцісла́ў, Ка́м..нец — Кам..не́ц, Га́нц..вічы — Ганц́..вічы, Ќ..пыль — К..пы́ль.

**Склад слова і словаўтварэнне.**

**6.** У якія марфемы ўваходзяць гукі, абазначаныя літарай *а*, у наступных словах:

| Словы | Марфема |
|---|---|
| У з о р: *свята* | *канчатак* |
| 1) дзейн**а**сць | |
| 2) пазнаёміцц**а** | |
| 3) д**а**статкова | |
| 4) насычан**а**я | |
| 5) **а**дкрыццё | |
| 6) цуд**а**творнай | |
| 7) скіраван**а** | |
| 8) выхав**а**нне | |
| 9) трэб**а** | |
| 10) п**а**мнажаць | |

**7.** Паводле «Беларускай граматыкі» (1985 г.), у беларускай мове для ўтварэння катайконімаў (назваў асоб па месцы жыхарства) ужываюцца суфіксы *-ец- (-ац-)*, *-анін- (-янін-)* і інш. Выпішыце назвы гарадоў, што сустракаюцца ў тэксце, і ўтварыце катайконімы м. р., далучыўшы той ці іншы суфікс (звярніце ўвагу, што ад некаторых гарадоў можна ўтварыць некалькі катайконімаў). Запоўніце табліцу:

| Назва горада | Катайконім | |
|---|---|---|
| | *-ец- (-ац-)* | *-анін- (-янін-)* |
| У з о р: *Мінск* | | *мінчанін* |

**8.** Устанавіце словаўтваральную аснову, словаўтваральны сродак і спосаб словаўтварэння для наступных слоў. Запоўніце табліцу, карыстаючыся ўзорам.

| Прыклад | Словаўтваральная аснова | Словаўтваральны сродак | Спосаб словаўтварэння |
|---|---|---|---|
| У з о р: *духоўнасць* | *духоўны* | *суфікс -асць-* | *суфіксальны* |
| 1) праводзіцца | | | |
| 2) двойчы | | | |
| 3) кніга(друкаванне) | | | |
| 4) сугучны | | | |
| 5) выстава | | | |
| 6) ф..тазона | | | |
| 7) сімвалічна | | | |
| 8) дз..сяты | | | |
| 9) пяцісотгод..е | | | |
| 10) адкрыццё | | | |
| 11) канферэнц (зала) | | | |

**Лексіка.**

**9.** Перакладзіце на рускую мову наступныя выразы з тэксту:

1) яно адзначаецца (што) год;
2) даўнія цэнтры асветы;
3) свята традыцыйна ладзіцца ў гарадах;
4) з багатай гістарычнай спа..чынай;
5) наведаць выставы і кірмашы;
6) сустрэцца з выдаўцамі;
7) сюды свята вярталася двойчы;
8) стылізаваны сонечны гадзі(н/нн)ік;
9) бронзавы абраз Божай Маці;
10) яшчэ адна нагода.

**10.** Знайдзіце ў тэксце словы, якія маюць наступныя лексічныя значэнні:

1) сукупнасць пісьмовых помнікаў якой-небудзь гістарычнай эпохі пэўнага народа;
2) адукацыя, навучанне;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) распаўсюджванне ў масах і тлумачэнне якіх-небудзь ідэй, ведаў, вучэння, поглядаў;

4) сукупнасць дасягненняў чалавецтва ў вытворчым, грамадскім і духоўным жыцці;

5) у гэтым годзе, гэты год;

6) сукупнасць узаемазвязаных структур або аб'ектаў абслугоўвання, якія складаюць і забяспечваюць аснову функцыянавання сістэмы;

7) устаноўлены ўрачысты абрад, парадак правядзення чаго-небудзь;

8) кніжны магазін;

9) звычаі, погляды, нормы паводзін і пад., якія перадаюцца ад папярэдніх пакаленняў наступным;

10) вялікі продаж тавараў, які праводзіцца ў пэўную пару года ў вызначаным месцы і часта звязаны з выстаўкай.

**Марфалогія.**

**11.** Пастаўце назвы населеных пунктаў, што сустракаюцца ў тэксце, у форму меснага склону і запоўніце табліцу.

| Канчаткі | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| *-е-* | *-і-* | *-ы-* | *-у-* | *-ах* | *-ім-* |
| | | | | | |

**12.** Выпішыце з тэксту антрапонімы (імёны і прозвішчы людзей) і пастаўце іх у форму меснага склону.

**13.** Вызначце лексіка-граматычныя разрады займеннікаў і пастаўце іх у пачатковую форму.

| Займеннік | Лексіка-граматычны разрад | Пачатковая форма |
|---|---|---|
| якое | | |
| усімі | | |
| гэтымі | | |
| яе | | |
| нашай | | |
| (пра) сябе | | |
| (ад) сам..га (пачатку) | | |

**14.** Запоўніце табліцу патрэбнымі формамі дзеясловаў у цяперашнім ці будучым часе абвеснага ладу. Вылучыце асабовыя канчаткі.

| Дзеяслоў | 2-я асоба, адз. л. | 1-я асоба, мн. л. | 2-я асоба, мн. л. |
|---|---|---|---|
| пазнаёміцца | | | |
| адзначыць | | | |
| берагчы | | | |
| перадаць | | | |
| шанаваць | | | |

**15.** Выпішыце з тэксту дзеепрыметнікі і абазначце ў іх суфіксы.

**16.** Ад вылучаных у трэцім абзацы дзеясловаў утварыце дзеепрыслоўі.

**17.** Са сказаў 10—12 выпішыце ўсе службовыя часціны мовы і назавіце іх.

**18.** Запішыце лікі словамі, паставіўшы колькасныя лічэбнікі ў патрэбную форму і ўтварыўшы адпаведны парадкавы лічэбнік у пачатковай форме. Запоўніце табліцу.

| | Д. скл. | Т. скл. | Парадкавы лічэбнік |
|---|---|---|---|
| XXIX | | | |
| 2003 | | | |
| 2017 | | | |
| 500 | | | |

**Сінтаксіс.**

**19.** Запоўніце пропускі ў табліцы прыкладамі з абзаца 2.

| Словазлучэнне | Галоўнае слова | Залежнае слова | Від сувязі |
|---|---|---|---|
| святочных мерапрыемстваў | | | |
| | | з выданнямі | |
| заўсёды насычаная | | | |
| | моманты | | кіраванне |
| | | нашай | |
| | знакавымі | | |
| | сугучны | | |
| | | шырока | |
| | | людзям | |
| яе людзям | | | |

**20.** Ахарактарызуйце граматычную аснову простых сказаў, запоўніўшы табліцу.

| № сказа | Дзейнік / дзейнікі | Выказнік / выказнікі | Тып выказніка |
|---|---|---|---|
| 6 | | | |
| 7 | | | |
| 12 | | | |
| 14 | | | |
| 20 | | | |

**21.** Адзначце характарыстыкі, уласцівыя сказу 16:

1) просты аднасастаўны сказ;

2) просты двухсастаўны сказ;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) просты дзеяслоўны выказнік;
4) састаўны іменны выказнік;
5) ускладнены адасобленым азначэннем;
6) ускладнены адасобленымі азначэннямі.

**22.** Дапішыце ці выберыце патрэбную інфармацыю пра сказ **19**.

Сказ з'яўляецца *(складаназлучаным, складаназалежным, бяззлучнікавым складаным)*. Складаецца з ___ граматычных частак. Граматычная аснова першай часткі: дзейнік ______, выказнік _______. Граматычная аснова другой часткі: дзейнік _______, выказнік ________. Граматычныя часткі звязаны з дапамогай ________ злучніка ___. Паміж граматычнымі часткамі выражаны ________ адносіны.

**23.** Ахарактарызуйце складаназалежныя сказы.

| № сказа | Тып даданай часткі | Сродак сувязі | |
|---|---|---|---|
| | | Злучнік | Злучальнае слова |
| 4 | | | |
| 9 | | | |
| 10 | | | |

**24.** Ахарактарызуйце сказ **3**. Выберыце адказ *так* ці *не*.

| Сцвярджэнне | Варыянт адказу |
|---|---|
| 1) гэта складаны сказ з рознымі відамі сувязі | так / не |
| 2) гэта бяззлучнікавы складаны сказ | так / не |
| 3) у сказе дзве граматычныя часткі | так / не |
| 4) у першай частцы ёсць аднародныя дзейнікі | так / не |
| 5) другая частка з'яўляецца няпоўнай | так / не |
| 6) у апошняй частцы ёсць аднародныя дапаўненні | так / не |
| 7) у апошняй граматычнай частцы састаўны іменны выказнік | так / не |
| 8) у апошняй частцы ёсць азначэнне, выражанае сінтаксічна непадзельным словазлучэннем | так / не |
| 9) паміж граматычнымі часткамі пералічальныя сэнсавыя адносіны | так / не |
| 10) паміж граматычнымі часткамі супастаўляльныя сэнсавыя адносіны | так / не |

**25.** Пабудуйце схему сказа **11**, вылучыўшы логіка-структурны блок. Дапішыце патрэбную інфармацыю пра гэты сказ.

У гэтым сказе ___ граматычныя часткі. Логіка-структурны блок утвараюць часткі ___ і ___. Граматычныя часткі блока звязаны паміж сабой ____________ сувяззю з дапамогай ___________. Граматычныя часткі блока ўтвараюць ___________ сказ з ___________ сэнсавымі адносінамі. Частка ___ і логіка-структурны блок звязаны ___________ сувяззю, паміж імі выражаны ________ сэнсавыя адносіны.

**Дадатковыя заданні.**

**26.** Вызначце стыль і тып тэксту.

**27.** Падзяліце тэкст на лагічныя часткі (падтэмы) і дайце ім назвы.

**28.** Адзначце нумар сказа, у якім, на вашу думку, заключаецца асноўная ідэя тэксту.

**29.** Назавіце асноўны тып сувязі паміж сказамі ў тэксце.

**30.** Пералічыце моўныя сродкі сувязі паміж сказамі ў першым абзацы.

## Для даведкі

**1.** Дзень беларускага пісьменства, нацыянальнае, штогод, спадчынай, кнігадрукавання, Заслаўе, Навагрудак, Нясвіж, Каменец, Ганцавічы, Глыбокае, Бялынічы, Капыль, пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў, літаратарамі, калектываў, аўтограф-сесія, фотазонах, цырымонія, лаўрэатаў, літаратурнай, перыядам, упершыню, у Полацку, падчас, дзясятага, адкрыты ўнікальны, 500-годдзе, сацыяльнай, у Ганцавічах, у Смаргоні, у Добрушы, у Хойніках, народнага пісьменніка, у Быхаве, у Іванаве, знака, пятнаццатаму, гадзінніка, дзяржаўнаму дзеячу, Вялікага Княства Літоўскага, у Слоніме, у Бялынічах, Дом кнігі, бібліятэкай, канферэнц-залай, у Капылі, ад самага, адрасавана, берагчы.

**2.** (3) Свята тройчы прымаў Полацк, двойчы — Тураў і Заслаўе, у розныя гады сталіцамі Дня беларускага пісьменства станавіліся Навагрудак, Нясвіж, Орша, Пінск, Мсціслаў, Мір, Каменец, Паставы, Шклоў, Барысаў, Смаргонь, Хойнікі, Ганцавічы, Глыбокае, Быхаў, Шчучын, Рагачоў, Іванава, Слонім, Бялынічы, Капыль.

(7) Удзельнікі і госці могуць пазнаёміцца з новымі кніжнымі выданнямі, сустрэцца з беларускімі і замежнымі літаратарамі, журналістамі, выдаўцамі, паслухаць выступы паэтаў і празаікаў, творчых калектываў і выканаўцаў, наведаць выставы і кірмашы, паўдзельнічаць у аўтограф-сесіях і зафіксаваць моманты свята ў фотазонах.

(11) Сюды свята вярталася яшчэ двойчы: у 2003 годзе падчас юбілейнага дзясятага Дня беларускага пісьменства ў Полацку быў адкрыты ўнікальны помнік літары «ў», а ў 2017 годзе тут адзначылі важную дату нашай гісторыі і культуры — 500-годдзе беларускага кнігадрукавання.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(16) У Іванаве адбылося адкрыццё памятнага знака, прысвечанага пятнаццатаму Дню беларускага пісьменства, — стылізаванага сонечнага гадзінніка.

(21) Дзень беларускага пісьменства — гэта яшчэ адна нагода звярнуць увагу на мастацкае слова, беларускую мову і культуру як духоўныя каштоўнасці, якія трэба шанаваць, берагчы і памнажаць.

**3.** 1) [й]; 2) [ж]; 3) [ы]; 4) [н’а тол’к’і], [ў], [і]; 5) [з’]; 6) [ат]; 7) [йаґ] ([ґ] выбухны).

**4.**

| Гукі = літары | Гукі > літары | Гукі < літары |
|---|---|---|
| Дня | многія | пісьменства |
| беларускага | праекты | людзям |
| знакавымі | сугучныя | |
| нашай | краіны | |
| падзеямі | тэматычныя | |
| шырока | прысвечаныя | |
| арганізуюцца | перыядам | |
| пляцоўкі | гісторыі | |
| розным | яе | |
| Беларусі | | |

**5.** Навагру́дак, Нясві́ж, Мсцісла́ў, Ка́менец, Га́нцавічы, Капы́ль.

**6.** 1) Суфікс, 2) постфікс, 3) корань, 4) канчатак, 5) прыстаўка, 6) злучальны галосны (інтэрфікс), 7) канчатак, 8) суфікс, 9) суфікс, 10) прыстаўка.

**7.**

| Назва горада | Катайконімы | |
|---|---|---|
| | *-ец- (-ац-)* | *-анін- (-янін-)* |
| Полацк | | палачанін |
| Тураў | туравец | тураўчанін |
| Заслаўе | заславец | заслаўчанін |
| Навагрудак | навагрудзец | навагрудчанін |
| Нясвіж | нясвіжац | |
| Орша | аршанец | |
| Пінск | | пінчанін |
| Мсціслаў | мсціславец | |
| Мір | | мірчанін |
| Каменец | | камянчанін |
| Паставы | | пастаўчанін |
| Шклоў | шкловец | шклаўчанін |
| Барысаў | барысавец | барысаўчанін |
| Смаргонь | смаргонец | |
| Хойнікі | | хайнічанін |
| Ганцавічы | ганцавец | ганцаўчанін |
| Глыбокае | | глыбачанін |
| Быхаў | быхавец | быхаўчанін |
| Шчучын | шчучынец | |
| Рагачоў | рагачовец | |
| Іванава | іванавец | |
| Слонім | слонімец | |
| Бялынічы | | бялынічанін |
| Капыль | | капылянін |
| Добруш | добрушац | дабрушанін |

8.

| Прыклад | Словаўтваральная аснова | Словаўтваральны сродак | Спосаб словаўтварэння |
|---|---|---|---|
| 1) праводзіцца | праводзіць | постфікс *-ца-* | постфіксальны |
| 2) двойчы | двое [двой-э] | суфікс *-чы-* | суфіксальны |
| 3) кнігадрукаванне | кніга + друкаваць | інтэрфікс *-а-* і суфікс *-нн-* | асноваскладанне з суфіксацыяй (складана-суфіксальны) |
| 4) сугучны | гук | прыстаўка *су-* і суфікс *-н-* | прыставачна-суфіксальны |
| 5) выстава | выставіць | суфікс *-ø-* | бяссуфіксны |
| 6) фотазона | зона + фатаграфаванне | — | абрэвіяцыя |
| 7) сімвалічна | сімвалічны | суфікс *-а-* | суфіксальны |
| 8) дзясяты | дзесяць | суфікс *-ø-* | бяссуфіксны |
| 9) пяцісотгоддзе | пяцьсот + год | суфікс *-ø-* | асноваскладанне з суфіксацыяй (складана-суфіксальны) |
| 10) адкрыццё | адкрыць | суфікс *-цц-* | суфіксальны |
| 11) канферэнц-зала | канферэнцыя + зала | — | словаскладанне |

**9.** 1) Оно отмечается каждый год / ежегодно; 2) древние центры просвещения; 3) праздник традиционно проводится в городах; 4) с богатым историческим наследием; 5) посетить выставки и ярмарки; 6) встретиться с издателями; 7) сюда праздник возвращался дважды; 8) стилизованные солнечные часы; 9) бронзовая икона Божьей Матери; 10) ещё один повод.

**10.** 1) Пісьменнасць, 2) асвета, 3) прапаганда, 4) культура, 5) сёлета, 6) інфраструктура, 7) цырымонія, 8) кнігарня, 9) традыцыі, 10) кірмаш.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

**11.**

| *-е-* | | *-і-* | *-ы-* | *-у-* | *-ах* | *-ім-* |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Тураве<br>Мсціславе<br>Шклове<br>Барысаве<br>Быхаве | Шчучыне<br>Рагачове<br>Іванаве<br>Слоніме | Заслаўі<br>Смаргоні<br>Капылі | Оршы<br>Міры<br>Каменцы<br>Нясвіжы<br>Добрушы | Полацку<br>Навагрудку<br>Пінску | Паставах<br>Хойніках<br>Ганцавічах<br>Бялынічах | Глыбокім |

**12.** (Аб) Якубе Коласе, Францішку Багушэвічу, Іване Шамякіне, Іване Мележу, Льве Сапегу.

**13.**

| Займеннік | Лексіка-граматычны разрад | Пачатковая форма |
|---|---|---|
| якое | азначальны | які |
| усімі | азначальны | увесь |
| гэтымі | указальны | гэты |
| яе | прыналежны | яе |
| нашай | прыналежны | наш |
| (пра) сябе | зваротны | сябе |
| (ад) самага (пачатку) | азначальны | самы |

**14.**

| Дзеяслоў | 2-я асоба адз. л. | 1-я асоба мн. л. | 2-я асоба мн. л. |
|---|---|---|---|
| пазнаёміцца | пазнаёмішся | пазнаёмімся | пазнаёміцеся |
| адзначыць | адзначыш | адзначым | адзначыце |
| берагчы | беражэш | беражом | беражаце |
| перадаць | перадасі | перададзім | перадасце |
| шанаваць | шануеш | шануем | шануеце |

**15.** Звязана, насычаная, прысвечаныя, адкрыты, усталявана, прысвечанага, стылізаванага, скіравана, адрасавана.

**16.** Вяртаючыся, адзначыўшы, пакідаючы, з'явіўшыся, трымаючы.

**17.** *Што* — злучнік; *у/ў* — прыназоўнік; *яшчэ* — часціца; *падчас* — прыназоўнік; *а* — злучнік; *і* — злучнік; *пра* — прыназоўнік; *не толькі, але і* — злучнік.

**18.**

| | Д. скл. | Т. скл. | Парадкавы лічэбнік |
|---|---|---|---|
| XXIX | дваццаці дзевяці | дваццаццю дзевяццю | дваццаць дзявяты |
| 2003 | дзвюм тысячам тром | дзвюма тысячамі трыма | дзве тысячы трэці |
| 2017 | дзвюм тысячам сямнаццаці | дзвюма тысячамі сямнаццаццю | дзве тысячы сямнаццаты |
| 500 | пяцістам | пяццюстамі | пяцісоты |

**19.**

| Словазлучэнне | Галоўнае слова | Залежнае слова | Від сувязі |
|---|---|---|---|
| святочных мерапрыемстваў | *мерапрыемстваў* | *святочных* | *дапасаванне* |
| *пазнаёміцца з выданнямі* | *пазнаёміцца* | з выданнямі | *кіраванне* |
| заўсёды насычаная | *насычаная* | *заўсёды* | *прымыканне* |
| *моманты свята* | моманты | *свята* | кіраванне |
| *для нашай краіны* | *для краіны* | нашай | *дапасаванне* |
| *знакавымі для краіны* | знакавымі | *для краіны* | *кіраванне* |
| *сугучным з падзеямі* | сугучным | *з падзеямі* | *кіраванне* |
| *арганізуюцца шырока* | *арганізуюцца* | шырока | *прымыканне* |
| *прысвечаныя людзям* | *прысвечаныя* | людзям | *кіраванне* |
| яе людзям | *людзям* | *яе* | *прымыканне* |

**20.**

| № сказа | Дзейнік / дзейнікі | Выказнік / выказнікі | Тып выказніка |
|---|---|---|---|
| 6 | праграма | насычаная | састаўны іменны |
| 7 | удзельнікі і госці | могуць пазнаёміцца, сустрэцца, паслухаць, наведаць, паўдзельнічаць і зафіксаваць | састаўныя дзеяслоўныя |
| 12 | Дзень беларускага пісьменства | пакідае памяць | просты дзеяслоўны |
| 14 | кампазіцыя | стала сімвалам | састаўны іменны |
| 20 | свята | скіравана, адрасавана<br>ахоплівае | састаўныя іменныя<br>просты дзеяслоўны |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**21.** 2, 3, 6.

**22.** Сказ з'яўляецца *складаназлучаным*. Складаецца з *2* граматычных частак. Граматычная аснова першай часткі: дзейнік *жыхары*, выказнік *атрымалі*. Граматычная аснова другой часткі: дзейнік *будынак*, выказнік *ёсць*. Граматычныя часткі звязаны з дапамогай *злучальнага* злучніка *а*. Паміж граматычнымі часткамі выражаны *супастаўляльныя* адносіны.

**23.**

| № сказа | Тып даданай часткі | Сродак сувязі | |
|---|---|---|---|
| | | Злучнік | Злучальнае слова |
| 4 | азначальная | | якія |
| 9 | вынікова | таму | |
| 10 | дапаўняльная | што | |

**24.** 1) Не, 2) так, 3) не, 4) не, 5) так, 6) не, 7) так, 8) так, 9) так, 10) не.

**25.** [ ]: [ ], а [ ].

У гэтым сказе *3* граматычныя часткі. Логіка-структурны блок утвараюць часткі *2* і *3*. Граматычныя часткі блока звязаны паміж сабой *злучнікавай* сувяззю з дапамогай *злучальнага злучніка а*. Граматычныя часткі блока ўтвараюць *складаназлучаны* сказ з *супастаўляльнымі* сэнсавымі адносінамі. Частка *1* і логіка-структурны блок звязаны *бяззлучнікавай* сувяззю, паміж імі выражаны *паясняльныя* сэнсавыя адносіны.

**26.** Публіцыстычны стыль, апісанне

**27.** Чатыры часткі: 1) сутнасць свята; 2) праграма святочных мерапрыемстваў; 3) памятныя культурныя і сацыяльныя аб'екты; 4) значэнне свята.

**28.** Сказ 21.

**29.** Паслядоўная.

**30.** 1) Тэматычная група слоў «беларускае пісьменства» *(Дзень беларускага пісьменства, пісьменства, друкаванае слова, асвета, культура, кнігадрукаванне, пісьменнікі, асветнікі)*; 2) сінонімы *(праводзіцца, адзначаецца, ладзіцца; прымаў свята, стаў цэнтрам свята)*; 3) рода-відавыя найменні *(Дзень беларускага пісьменства, свята, свята пісьменства)*; 4) лексічны паўтор (слова *свята*); 5) перыфраза (*цэнтры асветы, культуры і кнігадрукавання* — гарады); 6) займеннікі-замяшчальнікі (*свята* — *яно*, назвы гарадоў — *усе гэтыя* гарады).